Славутыя суайчыннікі

# ГРАФЫ ТЫШКЕВІЧЫ: РОД МЕЦЭНАТАЎ, ДАСЛЕДЧЫКАЎ, АСВЕТНІКАЎ

## Культуратворчая дзейнасць арыстакратаў-патрыётаў

**А. І. Смолік,**
загадчык кафедры культуралогіі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў,
доктар культуралогіі, прафесар



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Падчас работы V міжнароднага кангрэса даследчыкаў беларускай культуры, які праходзіў у г. Каўнасе ў кастрычніку мінулага года, мне пашчасціла наведаць палац Раўдондварыс (Чырвоны двор). Пра гэта я марыў даўно, бо з узгаданым палацам звязана дзейнасць шэрага знакамітых асоб айчыннай культуры. Акрамя таго, Чырвоны двор – адзін з самых старажытных помнікаў архітэктуры Вялікага Княства Літоўскага. Замак на гэтым месцы быў узведзены ў 1410 г. крыжакамі. Пасля разгрому Тэўтонскага ордэна ён стаў уласнасцю караля Рэчы Паспалітай, вялікага князя Літоўскага Жыгімонта II Аўгуста. Кароль ажаніўся з адной з самых прыгожых жанчын тагачаснай Еўропы Барбарай Радзівіл. Ён падарыў сваёй маладой жонцы замак Раўдондварыс разам з навакольным горадам. У 1551 г. Барбара нечакана памерла (мяркуюць, яе атруціла маці караля Бона Сфорца, якая была супраць гэтага шлюбу). На працягу двух стагоддзяў уладальнікамі Чырвонага двара былі князі Радзівілы. Яны неаднаразова перабудоўвалі замак у адпаведнасці са сваімі густамі і пануючымі стылямі. У XVIII стагоддзі Раўдондварыс куплялі і прадавалі розныя магнаты ВКЛ: Варлоўскія, Дзевалтоўскія, Касакоўскія, Забэлы.**

**З 1819 г. Чырвоны двор стаў уласнасцю графа Мікалая Тышкевіча, які перадаў яго свайму сыну Бенядзікту Эмануілу Тышкевічу (1801–1866 гг.). Разам з жонкай Вандай Ванькові́ч (1808–1842 гг.) Бенядзікт Эмануіл паступова пераўтварыў Раўдондварыс у сапраўдны культурны цэнтр ВКЛ.**

У 1830-х гадах Бенядзікт Эмануіл карэнным чынам перабудоўвае замак, разбураны падчас паўстання 1830–1831 гг. Тады ж былі ўзведзены царква, аранжарэя, два дамы для прыслугі, канюшня, ветраны млын. Аўтарамі праектаў будынкаў ансамбля былі знакамітыя італьянскія архітэктары Чэзарэ Анічыні і Францыска Андрыёлі. Тады ж у Раўдондварысе быў закладзены парк. Францыска Андрыёлі, бацька будучага таленавітага беларускага мастака і ўдзельніка паўстання 1863–1864 гг. Міхала Андрыёлі, распрацаваў праекты палацавых інтэр'ераў. Аздабленнем будынкаў ансамбля займаліся таксама славуты пейзажыст, акадэмік жывапісу Альберт Жамет і мастак Ёнас Баневіч. Тышкевічы стварылі самыя спрыяльныя ўмовы для дзейнасці знакамітых творцаў.



Жамет, у прыватнасці, менавіта ў гэты перыяд напісаў шэраг сваіх знакамітых палотнаў.

### Альберт Жамет

Граф Бенядзікт і графіня Ванда, як і ўсе прадстаўнікі тышкевіцкага роду, былі высокаадукаванымі людзьмі, грунтоўна ведалі гісторыю свайго краю, гісторыю еўрапейскай і сусветнай культуры, клапаціліся аб росквіце нацыянальнага мастацтва. Імі ахвяравана шмат уласных сродкаў на падтрымку таленавітых творцаў. Так, А. Д. Жамет (1821–1877 гг.) на сродкі Бенядзікта Эмануіла ўдасканальваў свае майстэрства ў Італіі.

Нарадзіўся Альберт Жамет у Вільні ў сям'і небагатага мешчаніна. Першапачатковую адукацыю атрымаў у Віленскай гімназіі, потым у якасці вольнага слухача займаўся ў Санкт-Пецярбургскай акадэміі мастацтваў, пад кіраўніцтвам прафесара М. М. Вараб'ёва асвойваў майстэрства жывапісу. Бенядзікт Эмануіл сачыў за творчасцю А. Жамета і імкнуўся дапамагчы творцы развіць прыродныя задаткі. Граф прапанаваў таленавітаму мастаку паехаць у Еўропу, каб пазнаёміцца з творчасцю выдатных жывапісцаў мінулага, удасканаліць з дапамогай знакамітых сучасных жывапісцаў уласнае майстэрства. На сродкі Бенядзікта Эмануіла Тышкевіча мастак 12 гадоў жыў у Англіі, Германіі, Італіі, Францыі, дзе вучыўся ў лепшых тагачасных майстроў. Менавіта там ён стварыў свае знакамітыя палотны «Від на возера Немі», «Тыволі і яго вадаспады», «Рымскі Калізей». За палатно «Від на возера Немі» мастак атрымаў прэмію ад Рымскай акадэміі св. Лукі (1854 г.). Карціна «Тыволі і яго вадаспады» была высока ацэнена Санкт-Пецярбургскай акадэміяй мастацтваў, за яе А. Жамет атрымаў званне некласнага мастака, а ўвогуле за цыкл карцін, створаных у Еўропе, – званне акадэміка (у 1859 г.). Гэтым творчым поспехам спрыяла дапамога высакародных мецэнатаў мастака – Бенядзікта і Ванды Тышкевічаў. І пэўна, невыпадкова ўдзячны Альберт Жамет падараваў графіні і графу Тышкевічам адзін з лепшых сваіх твораў – «Рымскі від» (быў змешчаны ў фамільную карцінную галерэю). Дарэчы, гаспадары Чырвонага двара сабралі ўнікальную калекцыю карцін – яна ўтрымлівала палотны Леанарда да Вінчы, Пітэра Паўля Рубенса, Венета Барталамея, Яна Матэйкі і інш. (На жаль, падчас Першай сусветнай вайны гэта калекцыя знікла.)



У 1864 г. славуты Альберт Жамет вяртаецца ў Вільню. Да канца свайго жыцця ён служыць дэкаратарам у Віленскім гарадскім тэатры. Сёння творы жывапісца экспануюцца ў шэрагу вядомых мастацкіх галерэй свету. У Эрмітажы, напрыклад, захоўваецца карціна А. Жамета «Арка-Скура і розныя віды вілы Бутэра ў Палерма».

### Фларыян Міладоўскі

Актыўна дапамагаў Бенедзікт Тышкевіч і беларускаму кампазітару Фларыяну Фабіянавічу Міладоўскаму (1819–1889 гг.), які па праве лічыцца адным з заснавальнікаў айчыннай прафесійнай музычнай культуры. Бацька Фларыяна валодаў фальваркам Навадворкі непадалёк ад Навагрудка, але збяднеў, вымушаны быў прадаць нерухомую маёмасць і перабрацца ў Менск. Грошы ён пачаў зарабляць урокамі музыкі. У Менску і нарадзіўся будучы знакаміты кампазітар. Заўважыўшы здольнасці сына да музыкі, бацька пачаў мэтанакіравана займацца з ім. Потым юнак удасканальваў сваё музычнае майстэрства ў Вільні пад кіраўніцтвам вядомага педагога-піяніста Фердынанда Тыбэ і ў Мінску пад кіраўніцтвам Дамініка Стэфановіча.

У пачатку 1830-х гадоў Фларыян Міладоўскі ўжо быў вядомым выканаўцам. Яго канцэрты з поспехам праходзілі ў Вільні, Менску, Слуцку і іншых беларускіх гарадах. На адным з такіх выступленняў і пачуў ігру Фларыяна граф Бенядзікт Эмануіл. Высока ацаніўшы талент піяніста, Тышкевіч запрасіў у 1836 г. Міладоўскага ў Чырвоны двор у якасці настаўніка музыкі для

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

сваіх дачок. Сам граф быў таксама аматарам класічнай музыкі і марыў аб стварэнні ўласнага сімфанічнага аркестра. Ён паведаміў пра гэты намер Фларыяну – той горача падтрымаў ідэю і выказаў жаданне стаць дырыжорам аркестра. На сродкі Тышкевіча Міладоўскі з мясцовых, а таксама запрошаных нямецкіх музыкантаў укамплектаваў сімфанічны аркестр, склаў для яго рэпертуар, а неўзабаве дабіўся і высокага выканальніцкага ўзроўню. Музыказнаўцы сцвярджаюць, што гэты музычны калектыў за кароткі час стаў адным з лепшых у тагачаснай Еўропе. Яго рэпертуар уключаў сімфанічныя творы Бетховена, Моцарта, Шуберта, іншых выдатных кампазітараў. Фларыян Міладоўскі і сам напісаў для свайго аркестра шэраг сімфоній. Для музычнага тэатра, які таксама існаваў у Раўдондварысе, гэты таленавіты кампазітар стварыў некалькі аперэт. Граф і графіня Тышкевічы маральна і матэрыяльна падтрымлівалі ўсе яго пачынанні.

Яшчэ ў юнацкім узросце, авалодваючы выканальніцкім майстэрствам пад кіраўніцтвам Д. Стэфановіча, Фларыян Міладоўскі пасябраваў са Станіславам Манюшкам, тады таксама вучнем таленавітага педагога. Станіслаў усё жыццё сачыў за музычнай творчасцю Фларыяна, даваў яму добразычлівыя, слушныя парады. Менавіта ён параіў Міладоўскаму на час спыніць музычную дзейнасць у Чырвоным двары і накіравацца ў Еўропу з мэтай удасканалення свайго майстэрства. Тышкевічу шкада было развітвацца з маэстра, але, разумеючы важнасць такой паездкі для таленавітага музыканта, граф не толькі не перашкаджаў гэтаму, але і ўзяў на сябе ўсе выдаткі, звязаныя з пражываннем Фларыяна ў Еўропе. На сродкі Бенядзікта дырыжор Раўдондварыскага аркестра два гады браў урокі ў лепшых еўрапейскіх кампазітараў і выканаўцаў: Ф. Мендэльсона (кампазіцыя), Ф. Хельтцля і С. Зэхцера (гармонія і паліфанія), І. Фішхофа (вакал і кантрапункт).

У 1843 г. Ф. Міладоўскі вярнуўся ў Чырвоны двор. Тышкевічы з радасцю сустрэлі таленавітага музыканта і стварылі выключна спрыяльныя ўмовы для яго дзейнасці. Дзякуючы гэтым клопатам Міладоўскі змог шмат часу аддаваць кампазіцыі, плённа займацца педагагічнай дзейнасцю. Не пакінуў без увагі Міладоўскі і сваё «дзіця» – аркестр. Ім ён кіраваў да апошніх дзён знаходжання ў Раўдондварысе. Тут жа Фларыян пазнаёміўся з настаўніцай французскай мовы Аўгусцінай Паро, якая неўзабаве стала яго жонкай.



У канцы 1840-х гадоў фінансавае становішча графа Тышкевіча пагоршылася. Палаца-паркавы ансамбль паступова прыходзіць у заняпад. Граф вымушаны рэзка скараціць выдаткі на мецэнацкую і асветніцкую дзейнасць, а таксама на ўтрыманне аркестра.

У 1851 г. Фларыян Міладоўскі з сумам ад'язджае з Раўдондварыса. Станіслаў Манюшка запрасіў кампазітара ў Вільню. Вядомы літаратурны і музычны крытык XIX ст. А. Жалязняк аб віленскім перыядзе творчасці Міладоўскага пісаў: «Ён і Манюшка да цяперашняга часу былі ў Літве дзвюма пальмамі ў выпаленай пустыні, пад якімі музыка мела магчымасць знайсці сабе прытулак» [5, с. 67].

## Славуты вандроўнік і таленавіты фотамастак

З Чырвоным дваром таксама звязана навуковая, асветніцкая, мастацкая і мецэнацкая дзейнасць унука Бенядзікта Эмануіла Бенядзікта Генрыка Тышкевіча (1852–1935 гг.), якому палаца-паркавы ансамбль дастаўся ў спадчыну. У Раўдондварысе прайшло яго дзяцінства. Хлопчык рана асірацеў, апекаваў яго дзядзька.

Пэўна, уражанні раўдондварыскага дзяцінства наклалі адбітак на ўсю будучую інтэлектуальную дзейнасць Бенядзікта Генрыка. У Тышкевічаў была цудоўная бібліятэка, і хлопчык рана палюбіў кнігі. Асабліва юны граф захапляўся апісаннямі геаграфічных адкрыццяў, падарожжаў у экзатычныя краіны. Пад уплывам іх у хлопчыка выспела настойлівае імкненне самому стаць вандроўнікам. Першая краіна,



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

якую ў дзяцінстве Бенядзікт Генрык наведаў разам з дзядзькам, была Францыя. Знаёмства з гістарычна-культурнымі помнікамі Францыі яшчэ больш умацавала яго мару. Як толькі малады граф Тышкевіч дасягнуў паўналецця і змог самастойна распараджацца фінансавымі сродкамі, ён пачаў сваю мару ажыццяўляць.

Напачатку вандроўнік наведаў Германію і Італію, але яшчэ больш яго вабілі краіны Азіі, Амерыкі, Афрыкі. Для ажыццяўлення пастаўленай мэты Бенядзікт Генрык вырашыў набыць уласную яхту, па якую ў 22-гадовым узросце адправіўся ў Паўночную Амерыку (у Бостан). Невядома па якой прычыне набыць там судна маладому графу не ўдалося, але з падарожжа ён вярнуўся з дачкой будаўніка яхт Альжбетай Кларай Банкрофт. Будаваць жа яхту Тышкевіч вырашыў па ўласным праекце на суднабудаўнічай верфі ў Гаўры (Францыя). У 1875 г. даўняя мара графа была рэалізавана: ён стаў уладальнікам прыгожага сучаснага судна «Жэмайція». (Дарэчы, на Сусветнай выставе ў Парыжы яхта і яе ўладальнік атрымалі залаты медаль.) На ім Бенядзікт Генрык і пачынае вандраваць па марскіх прасторах. На ўласныя сродкі граф здзяйсняе шэраг марскіх археалагічных экспедыцый у Індыю, Кітай і Японію. З экспедыцый ён прывозіў вельмі каштоўныя для навукі археалагічныя калекцыі, мноства фотаздымкаў.

Паспяховыя ўсходнія марскія экспедыцыі стымулявалі ў Бенядзікта Генрыка імкненне ажыццявіць падарожжа вакол свету. Ён пачаў старанна рыхтавацца да працяглай і небяспечнай вандроўкі: вывучаў навігацыйныя інструкцыі, знаёміўся з месцазнаходжаннем маякоў, набыў неабходнае абсталяванне і падабраў экіпаж з сарака вопытных мараходаў. Графіня Альжбета Клара заўсёды падтрымлівала планы мужа і ахвяравала на экспедыцыі значную частку асабістых сродкаў.

Калі ўсё было гатова, граф адправіўся ў падарожжа вакол свету. Але ў гэты час пачалася руска-турэцкая вайна, а тэрыторыя, якая раней належыла ВКЛ, уваходзіла ў склад Расійскай імперыі. Таму, наведаўшы Крым і Алжыр, граф вымушаны быў спыніць падарожжа [1].

Бенядзікт Генрык Тышкевіч не толькі вандраваў сам, але і садзейнічаў ажыццяўленню марскіх падарожжаў іншымі энтузіястамі. Напрыклад, аказаў фінансавую і арганізацыйную дапамогу яхтсмену С. Рагазінскаму, які ажыццявіў першую польскую марскую навуковую



экспедыцыю. У знак удзячнасці падарожнік назваў імем Тышкевіча возера ў Камеруне.

Падчас экспедыцый Бенядзікт Генрык захапіўся авангардным для таго часу заняткам – фотамастацтвам. Яно дапамагала яму перажыць вялікае гора (заўчасную смерць горача любімай жонкі) і знайсці сілы на выхаванне траіх дзяцей.

Бенядзікт Генрык Тышкевіч перязджае на Лагойшчыну, пасяляецца ў маёнтку Вялае і пераўтварае некалі сціплы паляўнічы домік у Налібоцкай пушчы ў графскую сядзібу. Значная частка дома адводзіцца пад добра абсталяваную фотастудыю і фотаархіў. Граф стварае фотапартрэты знакамітых дзеячаў беларускай навукі, мастацтва, робіць шматлікія фотаздымкі аб'ектаў духоўнай і матэрыяльнай культуры нашага народа. Сярод фотаработ Тышкевіча шмат выяў беларускіх сялян. У полі зроку фотамастака – побыт розных сацыяльных груп беларускага грамадства, іх заняткі, вольны час, адзенне, інтэр'еры і экстэр'еры жытла і г. д.

Ужо ў 1876 г. фотаработы Бенядзікта Генрыка Тышкевіча былі прадстаўлены на выставе ў Філадэльфіі, а пазней нават заваявалі залатыя медалі на выставах у Польшчы (1894 г.) і Берліне (1899 г.).

Будынак фоталабараторыі ў маёнтку Вялае захаваўся да нашых дзён, але сёння знаходзіцца ў страшэнным запусценні. Фотаархіў быў знішчаны, аднак нечакана ў 1993 г. у аднаго з французскіх антыквараў знойдзены фотаальбом з 86 вельмі якаснымі фотаздымкамі Б. Г. Тышкевіча. У Францыю, як мяркуюць даследчыкі, іх прывёз сам граф, які пражыў там астатак свайго жыцця і быў пахаваны. Альбом набыло французскае Таварыства сяброў музея Нісяфора Ньепса, які лічыцца вынаходнікам фатаграфіі. У 1999 г. копіі фотаздымкаў, зробленых на беларускай зямлі, выстаўляліся ў Вільнюсе і Каўнасе. Беларускія фотааматары

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўбачылі калекцыю фотаработ Б. Г. Тышкевіча ў 2009 г. на выставе ў Нацыянальным музеі гісторыі Рэспублікі Беларусь, зладжанай з нагоды 170-годдзя вынаходніцтва фатаграфіі. Яе арганізатарамі былі амбасада Францыі ў Рэспубліцы Беларусь і Беларускае грамадскае аб'яднанне «Фотамастацтва».

Такім чынам, беларусы праз 100 гадоў атрымалі магчымасць пазнаёміцца з творчай спадчынай свайго славутага суайчынніка. Вельмі шкада, што не быў створаны каталог твораў Б. Г. Тышкевіча, як гэта зрабілі літоўцы і палякі падчас экспанавання фотаздымкаў беларускага майстра ў іх краінах. Таму, калі хтосьці зацікавіцца гэтым унікальным скарбам, можна паехаць у Чырвоны двор, які рэстаўрыраваны, знаходзіцца ў добрым стане і дзе экспануюцца многія шэдэўры Б. Г. Тышкевіча...

## Не шкадуючы працы і скарбаў

Знаёмства з культурна-асветніцкай дзейнасцю прадстаўнікоў роду графаў Тышкевічаў сведчыць, што пераважная большасць з іх прытрымлівалася асноўнага прынцыпу мецэнацтва, сфармуляванага ў XVI ст. Францыскам Скарынай. Асветнік-гуманіст заклікаў пануючыя колы аддаваць сябе цалкам і поўнасцю «размнажэнню мудрасці, умення <...>, розуму и навукі», не шкадуючы «працы і скарбаў» [3, с. 135].

Кіруючыся гэтым запаветам вялікага мысліцеля, Канстанцін і Яўстафій Тышкевічы ў 1856 г. ахвяравалі Віленскаму музею старажытнасцей уласную бібліятэку (3 тыс. кніг), археалагічную калекцыю з 2 тыс. адзінак. Браты на ўласныя сродкі пабудавалі чатыры судны для навуковай экспедыцыі па рацэ Віліі, падчас якой быў сабраны багаты этнаграфічны, фальклорны і археалагічны матэрыял.

На сродкі Юзафа Тышкевіча ў Валожыне ў 1815 г. быў узведзены велічны касцёл св. Юзафа, а таксама Валожынскі палац – помнік архітэктуры класіцызму, якія да сённяшняга часу з'яўляюцца галоўнымі планіровачнымі элементамі горада. У Лагойску Тышкевічы пабудавалі дзве ўніяцкія і дзве праваслаўныя царквы, браты Аляксандр і Вікенцій Тышкевічы на працягу шасці гадоў (1787–1793 гг.) фінансавалі будаўніцтва мураванага касцёла Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі і святога Казіміра. Уладальнікамі Лагойска заснаваны фабрыкі льняных і бавоўняных вырабаў, шкляны завод, ліцейнае прадпрыемства, цукровы завод, крэдытны банк.

Мецэнатамі з'яўляліся і Тышкевічы, якія гаспадарылі ў Свіслачы. Тадэвуш, Казімір і Вікенцій на працягу XVII–XVIII стст. ператварылі невялікае мястэчка ў сапраўдны прамысловы і культурны горад. У ходзе рэканструкцыі мястэчка з'явілася рыначная плошча з фарным касцёлам, уніяцкай царквой, вежай з гадзіннікам. Графам Вікенціям закладзены парк і заапарк. У 1880-х гадах быў узведзены будынак тэатра, дзе ставіліся балеты і музычныя сцэны. Усе прафесійныя трупы, якія прыязджалі ў Свіслач, В. Тышкевіч браў на сваё ўтрыманне, плаціў акцёрам грошы, лепшых узнагароджваў каштоўнымі падарункамі.

У 1805 г. граф В. Тышкевіч на свае сродкі заснаваў у Свіслачы гімназію, якую ў розныя часы скончылі С. Горскі, Ю. Крашэўскі, Н. Орда, Р. Траўгут. Гаспадар Свіслачы выдаткаваў для гімназіі 1000 злотых і прадаставіў будынкі. На развіццё гэтай навучальнай установы завяшчаў 30 тыс. рублёў срэбрам. Граф матэрыяльна падтрымліваў настаўнікаў, якім не хапала пакояў у будынках гімназіі, выдаткоўваючы ім грошы на наёмнае жыллё. Бяднейшыя навучэнцы таксама атрымлівалі сродкі для аплаты па найме пакояў. З графскага маёнтку ў гімназію пастаўлялася паліва [4, с. 47–48].

Увогуле высокі ўзровень айчыннай культуры мінулых стагоддзяў у большасці сваёй быў дасягнуты дзякуючы актыўнай мецэнацкай дзейнасці беларускіх магнатаў, сярод якіх – прадстаўнікі славутага роду графаў Тышкевічаў.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Гловацкий, В.** Увлекательный мир парусов: очерки по истории парусного спорта / В. Гловацкий; пер. с польск. Л. Васильева, В. Кона. – М.: Прогресс, 1981. – 312 с.
2. **Капилов, А. Л.** Музыкальная культура Беларуси XIX – начала XX веков / А. Л. Капилов, Е. И. Ахвердова. – Минск: Институт современных знаний, 2000. – 144 с.
3. **Конан, У. М.** Скарына (Скарыніч) Францыск [Францішак; 1490 (?) – 1551 (?)] / У. М. Конан, С. А. Падокшын, І. А. Юхо // Мысліцелі і асветнікі Беларусі: энцыкл. даведнік. – Мінск: БелЭн, 1995. – С. 123–137.
4. **Патоцкі, Л.** Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану / Л. Патоцкі; пер. з польск. І. У. Саламевіч. – Мінск: Полымя, 1997. – 270 с.
5. **Zelezniak, A.** Gubernia Minska pod wzgledem muzykalnym / A. Zelezniak // Ruch Myzyczny. – 1858. – № 50. – S. 67.




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ